**Малявальшчык коміксаў, які завыў**
**па-ваўчынаму**
**(Excerpt in Belarusian)**

Translated by: Inesa Kuryan
Contact of the translator: plucha@mail.ru

Пару тыдняў таму я сустрэўся на каве са сваёй знаёмкай і пачуў адну неверагодную рэч. Не паверыў. Думаю, вы б таксама не паверылі. Справа ў тым, што Таварыства аховы дзікіх жывёлаў на Дзінарскім панізоўі штогод складае перапіс славенскіх ваўкоў, прыцягваючы дабраахвотнікаў, якія радыя пад поўняй паскуголіць ды зарэгістраваць, колькі ваўкоў адгукнулася.




- **Што?! – аслупянеў я.**
- **А вушы на што? Мы са сваім маляткам, Андрэйчыкам нашым галасістым, рыхтык запішамся.**
- **Што?!**

Без жартаў. Пачуўшы пра такое, я зразумеў, што мушу гэта пабачыць. Мо, мне таксама ўзяць з сабой сыночка? Нашае малятка – той яшчэ лÜпафіл, але няхай шчэ з пару гадкоў патрэнуецца.




**Уяўляю, як сын бы мне запярэчыў:**

- **Аyyyy, аyyyy!**
- **Не, Тарасік, дзяржаўны перапіс ваўкоў, справа адказная, ён праводзіцца выключна ўночы, калі малыя дзеці кладуцца спацькі.**
- **Аууу, аууу, і я пайдуууу!**
- **Не, дзяцей не бяруць, каб яны ваўкоў не распужалі!**

---

А як працэдуральна гэтая ініцыятыва выглядае для дарослых? Намерыліся ў лес да ваўкоў? Павыць захацелася? А дыплом біятэхніка ё? Няма – ідзіце спачатку на курс, дзе вам злюшчы дзядзька-прахвесар, які сусвет абыйшоў, перапісваючы малеючыя колькасці мядзьведзяў ды снежных барсаў, правядзе інструктаж па зносінах з ваўкамі.

Чаму ўсё так сур’ёзна? Бо на дадзены момант у Славеніі жытлуе усяго 9 ваўчыных зграй колькасцю прыкладна 7 асобінаў кожная. І ў параўнанні да даўгіх ступленых ланцужккоў касматых пачвараў, якія, як у рускіх казках, па снежных сумётах вынюхваюць заблуканага вандроўніка, нашыя ваўчыныя зграі складаюцца з крыху незадаволенай ваўчыным жыццём мамашы, вострaзубага таты і іхніх пагодкаў з сёлетнега і мінулагодняга мёту.




**Так і хочацца спытаць у гэтай славенскай малалічбавай зграі, пагартаўшы перад курсавым залікам “Белага клыка” Джэка Лондана ці паслухаўшы для парадку оперу Пракоф’ева “Пеця ды воўк”:**

- **А вы ўпэўненыя, што вас трэба лічыць дзікай зграяй, а не звычайнай ваўчынай сям'ёй? Той воўк, што ўсынавіў Маўглі, не лічыўся правадыром зграі, яго проста называлі Акелам.**

**Потым, падумаўшы, дадаць:**

- **Ну, што вы скажаце на маё сацыялагічнае апытанне?**

**Незадаволеная ваўчыным жыццём мамаша, штодзённа гатуючы мясны булён ля пліты, накажа свайму ваўчанёнку:**

**- Віхляй, як можаш, а ў пастку не трапляйся!**

**Малы наб’е рот ягняцінкай і не скажа ані слова. Тата-воўк рыкне па строгасці:**

- **Укусіце ж яго нарэшце хто-небудзь!**

---

Ваўчкі хутка растуць, а бацькі неадкладна жадаюць іх пазбавіцца і рана гоняць прэч. Маладыя ж ваўчукі потым паасобку бадзяюцца па свеце, пакуль не выйдуць на незанятую прастору, дзе час знайсці сабе самку і стварыць уласную дзікую зграю. А вось, ці жыць яму ў вызначаных межах, ці не жыць – давядзецца праверыць выццём: ніхто не адклікаецца – жыві сабе, а завыў нехта ў адказ – арэал ужо заселены.




---

**Так і ўяўляю, як вандроўны ваўчук прыцёпаў, а хоць бы да мястэчка Піўка, і заскуголіў:**

- **Ці ёсць у Піў-іў-іўцы месца, з якога мяне не выў-выў-выставяць?**

**А яму з кустоўя нейкі ваўчара хрыпіць:**

- **Адыдзіся, маляк! Не бачыш, што кантора занятая?**

**А побач з ім сваячок з дзікай зграі – “Цпык!” – сваім блатным складанчыкам.**

---

Пасля тэарэтычнага курсу настаўнікі-біёлагі планамерна пераходзяць да практыкі выцця.




---

**Выкладчык нібы дырыжор маша рукамі і папраўляе кожную фальшывую ноту.**

- **Ауууууу!!! – вые практыкант.**
- **Ага! Ага! Бяры вышэй на сярэдзіне! Андантэ, андантэ! Па троху, плаўна выходзь на апошнюю ноту!**

**Практыкант ажно выгнуўся ў лук і заскуголіў з асалодай:**

- **Цяпер мабыць добра! – нашчупаў практыкант патрэбную інтанацыю.**

---

Вось цяпер толькі ўсё пачынаецца: тры вечары запар ты павінен адразу пасля заходу сонца атабарыцца на цэлую гадзіну ў вылучанай акрузе і падскугольваць на найбольш высокіх узгорках тых чатырох квадрантаў, на якія ўмоўна падзелены кожны лакальны ваўчыны арэал.

Мне, напрыклад, давялося падвываць у раёне Рыбніцы, і першы вечар я быў памагатым для тутэйшага паляўнічага, які мне ў час гойсання па лясных сцяжынах міма барсукоў, лісіц і зайцоў распавядаў прышпільныя показкі паляўнічых.




**Да мяне далятаалі ўспаміны пра ваўчыцу Тоню, што доўга вадзіла адну зграю, а аднойчы ад яе знайшлі толькі парваны нашыйнік. Цудоўна было паслухаць пра разлад у нейкай зграі з той прычыны, што павадыр знайшоў новую жонку. Пра тое, як валанцёраў прынялі за браканьераў. Як хтосьці кудысці перамяшчаўся што паўгады, і яго знаходзілі ў іншым арэале.**

---

На першых трох выхадах на пазіцыю мы чулі толькі нейкі дзіўнаваты шоргат, які наш інструктар інтэрпрэтаваў не горай за вяшчуна.




- **У-йііііфа! У-йііііфа!**
- **Вой! Хто гэта?!**
- **Шышок.**
- **Йііп! Йііп! Йууп!**
- **А гэта?**
- **Лісіца.**
- **Ваў! У натуры рудая бестыя так адгукаецца?**
- **А-руля! А-руля! А-руля!**
- **Ах, мама! А гэта яшчэ хто?**
- **Не ведаю. Магчыма, куніца.**

---

А вось два апошнія начныя чуванні вынікавалі водгукам двух радавітых ды злонамысных “А-уууу!”




- **О! Чуеш?**
- **Здаецца, гэта сапраўднае ваўчынае выццё.**

---

Дзеля поўнага шчасця паляўнічы павёў мяне ў сваю акругу, дзе ён дакладна вызначыў межы адной дзікай ваўчынай зграі, бо тая заўчора ў суседніх вёсках загрызла 14 авечак, а 9 паспела зацягнуць у лес.




**Ваўчынае выццё загучала для мяне з-за кожнага куста.**

- **Ого-го, як яны разгуляліся!**

- **А, можа, гэта, сабакі?**
- **Не, гэта дакладна ваўкі.**

---

Вяртаючыся, мы с паляўнічым крыху пасварыліся між сабой. Падобна, біёлагі даўно выйшлі на выццё гэтай дзікай зграі, але ж вырашылі, што лепш яе больш не турбаваць.

І ўсё ж наступнага дня я насмеліўся на яшчэ адну экспедыцыю, гэтым разам з замежнымі партнёрамі арганізатараў ваўчынага перапісу: з адной харвацкай біялагіняй і адной аўстрыяцкай з ейным мужам, якія адну палову вольнага часу прысвячаюць выратаванню мядзведзяў-плясуноў з цыркавай няволі, а другую палову малююць ілюстрацыі для навукова-папулярных брашурак заапаркаў.




**- Няўжо мядзведзі не пакутуюць без сваіх ранейшых цыркавых прыплясаў?**

**- Ха-ха-ха! Ну, ты разважаеш чыста як рускі Ваня! Рускія заўсёды лічаць, што звяры шчаслівыя толькі ў няволі. Пры гэтым адну з іхніх танцоўшчыц мядзведзі зжэрлі, калі яна звінела ім бубенцамі.**

**- Вось яно як...**

**- Хоць я лічу, што тут прычына была ў тым, што яна для бляску насмароўвала ногі менавіта мядзвежым тлушчам наместа крэму.**

**- А! Ясна...**

---

Нам, дарэчы, з гэтай экіпай вельмі пашчасціла пачуць на перадапошняй пляцоўцы масавае выццё маладых ваўкоў, што азначала, што арэалы іх рассялення вызначыліся і мяжуюць між сабой, а нам за тое належыў адзін выходны.




**Маладыя ваўкі вылі з усіх бакоў. Падвыванні адзін па адным вярталіся да нас бумерангам. Ваўчыныя галасы былі моцнымі і ўпэўненымі. Я ж, наліўшы сабе вінца дзеля смеласці, думаў, што, магчыма, гэта сапраўдны поспех для мяне, як пачаткоўца. Я нават вырашыў у свой заслужаны выходны пацешыць сябе культпаходам у кіно.**

---

Фільм *Выпускнік* на Кангрэснай плошчы быў цудоўным дэсертам пасля маіх прыгодаў. Мне ўжо зараз карціць на наступны год ізноў пайсці дабраахвотнікам на ваўчыны перапіс.

Аууууууу (forte, forte, non troppo legerro)!

## ДЗІЦЯЧЫ ПРАЕКТ

Скажу шчыра, я не прыхільнік сучасных кніжак-ілюстраванак для малых.

Адна з тэмаў, якая мяне найбольш хвалявала, калі я чакаў, што маё ўласнае дзіця вось-вось народзіцца з-пад сэрца – як сумяшчаць дзіцячую радасць жыцця з неўскладненай да дэбільнасці праграмай развіцця дзяцей у нашыя часы.




---

**Пачынаць трэба ва ўлонні матулі:**

- **Малы, глядзі – гэтая кніга добрая, а гэтую чытаць не варта. Усвядоміў?**

**А малы лапоча з жывата:**

- **Не бачу розніцы.**

**І ўсё гэта на маёй бацькавай галаве.**

**- Добра, паказваю яшчэ раз.**

---

Фрэнды мне кажуць, што я празмерна ідэалізую забаўляльную частку свайго ўласнага дзяцінства. Але ж варта параўнаць улюбёныя мульты-маляванкі майго перыяду з прапановамі для сучаснага прадстаўніка дзіцячай аўдыторыі. Возьмем для прыкладу Вожыка ў тумане з сабачкам Рэксям і параўнаем са свінкай Пепай ды цягнічком Томі. Ці вылучаецца вам тут хоць нейкая розніца, акрамя пункту выйсця – першыя мульты да нас дайшлі з так званага ўсходняга блоку, апошнія – з заходняга?

А я вам скажу, што розніца вылучаецца канкрэтная: Вожык у тумане з сабачкам Рэксям былі так прыдуманыя, что настойліва парушалі законы фізікі ды добрых паводзінаў, а ў канцы гучалі фанфары шчасця на фоне дабрабыту. Свінка Пепа поруч з цягнічком Томі жывуць у банальным свеце штодзённых клопатаў, з чаго ў канцы выводзіцца маральная пуэнта, якая павінна садзейнічаць камфартоваму самапачуццю ў грамадскім бытаванні.




---

**Уявім сабе: маленькая Свінка Пепа корпаецца ў пяскоўніцы. Да яе падыходзіць Папа Свін:**

- **Хадзем, дачушка, я пакажу табе, як гуляцца ў снежкі.**
- **Не, не пайду. Мама мне сказала гуляцца толькі ў пяскоўніцы, а на забаўляльную пляцоўку я магу хадзіць выключна з авечкай С’юзі.**

---

Ведаю, што ёсць фэнтазі-маляванкі для старэйшай шантрапы, і гэткая_ літаратура ў вялікай колькасці ды differentнасці друкуецца на патрэбу спажыўцоў. Але ж, мы, відаць, неяк праскочылі той прамежкавы стан паміж фантазіяй і чалавечым жыццём, удала ўвасоблены ў Вожыку ў тумане з сабачкам Рэксям, пакінушы сёння толькі палярныя варыянты – поўнае супадзенне з рэгламентаванай грамадскай замовай па адным баку і занурэнне ў свет без існуючых правілаў фантазіі – па другім.




**Уявім сабе гэтыя фэнтазі-маляванкі:**

**Нейкая дзіўная непрыгожая істота нялюдзкага выгляду, нібыта настаўнік-касміт, з грубай пухірчатай скурай лімонава-лілёвага колеру, са званочкам на канцы прычольнага выростку, падзыньківаючы, прабуе навучыць абодватварага фэнтазі-дзіцёнка напісанню “еўраCiBi” на дзвюх касмічных мовах. Пры гэтым ягоны нянька-лесавік, які нагадвае калабка з вялікімі вушамі, шкрабе патыліцу і не ўяўляе, як малое адолее такую задачу. А недзе побач нейкай касмічнай не вароне, а як мінімум крукаўроне, абязглуджаны канструктарапалы монстр чыкануў альбо наўпрост выпаліў лазерам хвост, і грыміць сваім мэталёвым голасам:**

- **Супраць майго іённага бласцера у цябе няма ніякіх шансаў схавацца, крукаўрона!**

  **А шчаслівая бязхвостая крукаўрона каркнула агіднаму монстру ў адказ:**

- **Крукаўроны свайго шансу не губляюць!**

---

Гэта гучыць, як дыягназ сучаснасці не толькі на ўзроўні дзяцячага свету, але і на ўзроўні свету дарослых, якія ўвесь час нам укладаюць у вушы, што трэба глядзець праўдзе ў вочы, прыняць паслядоўнасць развіцця дарвіністычных тэорый, а не занурацца ў летуценні. З іншага ж боку, нам, узалежненым ад фантазіі, на суровым глабальным рынку за немалыя грошы прадаюць інфантыльныя сусветы з living рознымі хобітамі і марвеламі. Можа, варта да гэтага прыгледзецца?

Свінка Пепа ўсё ж, малаактыўная асоба, а вось у цягнічку Томі, калі задумацца, закладзена немалая небяспека. Пачнем з уступных абставінаў: на ізаляванай выспе створана нейкая прафесійная ячэйка цягнічкоў, якія, з аднаго боку, падобныя да дзяцей, пры гэтым яны ўкалываюць дзень і ноч, у завею ці пад праліўным дажджом або ў спёку на шэфа чыгункі з класічным выглядам капіталіста XIX стагоддзя: фрак, цыліндар і тоўстае бруха.




---

**Пакуль цягнічкі перакідваюцца мячыкам, галоўны эксплуататар пытаецца ў галоўнага інжынера:**

- **Як вы мяркуеце, колькі ў кожным з іх дзіцячых сіл? Дайце мне хоть прыблізную статыстыку!**
- **Мы не мераем іх патэнцыял у дзіцячых сілах – гэта ж машыны!**

---

У кожным эпізодзе гарэзлівыя цягнічкі на нейкі час зрываюць працоўны працэс і ствараюць праблемы свайму шэфу. За што іх караюць максімум звышурочнымі, а яны, вясёлыя і шчаслівыя, адпраўляюцца спаць у гараж, які забудовай нагадвае змрочнае сіроцкае жытло з твораў Чарльза Дзікенса, дзе толькі па-крыёму можна абмеркаваць навучкі мінулага дня.




**Гэтак стаяць цягнічкі ў гаражы і шэптам падвынікоўваюць:**

- **Мы ўсе на тое маем моц, каб наша моц была карыснай!**

---

Да падобных глыбокіх высноў прыйшоў цягнічок Томі, калі ягоныя спаборніцтвы з мясцовым пад’ёмным кранам, хто з іх мацнейшы, скончылася тым, што зламаліся абодва.

У наступным эпізодзе нашае механізаванае дзіцятка адшукала шмат радасці ў абплюхванні сваіх сяброў падчас інтэнсіўнага перасячэння калюгаў. Усё б прайшло бяскрыўдна, адно брудныя кроплі раптам патрапілі на вагончыкі, у якіх захоўвалася мука і клубніцы на падвячоркавыя піроржныя да гарбаты. Вось і давялося цягнічку Томі з дзікай хуткасцю насіцца па ўсёй выспе, каб паспець з дастаўкай новых незаплюханых кампанентаў і супакоіць абуранае кіраўніцтва. Таўстуны-гаспадары задаволена сядалі да стала з піроржнымі, толькі крышачку спазніўшыся, а цягнічок Томі тым часам гераічна змагаўся са спакусай пракаціцца па яшчэ адной калюжыне, хоць, заўважым, нікога побач не было на абплюхванне. Такім чынам, цяжкі працоўны дзень з вялікімі намаганнямі скончыўся шчасліва.




**Цяпер вясёлы Томі праносіўся міма калюгаў з радасным крыкам:**

**- На сёння ўжо хапіла плюскання!**

---

Ну, добра, скажаце вы, надзвычай сумняючыся і ўздрыгатнуўшы ад спосабаў узгаданага выхавання, але твой малы ўсяго гэтага яшчэ не разумее, і цягнічок Томі яму цікавы, ён з прыемнасцю глядзіць на ўсе гэтыя пыхкаючыя, імклівыя, лётаючыя па справах машыны. Правільна, наступіць дзень, калі ён аднак гэта зразумее, і замарочка ў тым, што дзіцячы досвед ужо залезе яму пад скуру, яшчэ да таго, калі ты раптам пачнеш заўважаць у сваім водпрыску нешта дзіўнае. Адначасна, калі дзіця радасна верашчыць над разважаючымі пра мараль цягнічкамі, мяне ліхаманкава непакоіць бессэнсоўнасць і дэбільнасць сумятні ягоных любімцаў.




**З экрану чуецца:**

**- Не пагаджаючыся са спадаром Відэрмаерам, мы шкодзім сабе!**

**- Нам лепш добра папрацаваць, ён адзначыць нашыя старанні і пахваліць нас!**

**Вось такое «Чух-Чух!», «Пух-Пух!». Я гляджу на сына з глыбокім сумам, а яму ўсё падабаецца:**

**- Хі-хі! Цягнічкі!**

---

Падвынікоўваючы скажу, што мне з большага важна тое, як мы з маім малюком добра праводзім час, калі разам назіраем за дзіцячай афертай. Дзіцячыя праекты шмат карыснага падказваюць дарослым, якія выхоўваюць дзіця, пераважна чакаючы, што калі-небудзь дзіцячы перыяд скончыцца, таму можна прыкрыць вочы на густы, якія фармуюцца ў дзяцінстве.

Маляванкі, ад якіх церпяць не толькі дзеці, але і бацькі, мне падаюцца важнымі яшчэ з адной прычыны. Існуе неабходнасць у падміргванні дарослай публіцы, каб діця заўважыла, што ягоныя бацькі лепей разумеюць узровень твораў, які для яго пакуль не дасягальны. І яму будзе ясна, што ён яшчэ маленькі, што трэба шмат чаму навучыцца; а бацькі з вышыні свайго аўтарытэту працягнуць малому руку, каб і ён некалі перапоўз паступова на гэты ўзровень.

Той дзіцячы праект, што мы назіраем, цалкам скалочаны на памер дзяцячага розуму, і ён малому дасылае зразумелыя сігналы: твой ненадта складаны інтэлектуальны свет

цалкам для цябе дастатковы – у ягоных межах мы акурат і стварылі асаблівы дамок, асаблівую мэблю і асаблівую мову ўдзельнікаў. Не спяшайся ўдзірацца ў заблытаны свет дарослых, а то яны яшчэ цябе навучаць уласным радасцям жыцця, якімі з’яўляюцца розныя там дзіўныя гастранамічныя прэферэнцыі, гартанні надзвычайных часопісаў, бо, як вядома, гэта ўсё залішнія прыемнасці, і табе давядзецца пераконваць іх вярнуцца ў свой прыўкрасненькі універсум, які бездакорна сфармаваны.




- **Тата! Хадзі ў мой дамок, – будзе клікаць вас малое.**
- **А-а, ты па мяне прыйшоў? Не, – прамычыце вы, выхопваючы апошнія навіны з медыяў.**

---

І калі я зноўку пашыру канцоўку на быццам цалкам дарослую сферу, а гутарка вядзецца пра ТВ праграммы на недзіцячых каналах, то паўстае тое ж пытанне: хіба ж усе існуючыя рэаліці-шоу выпрамянёўваюць на народ нешта больш карыснае і разумнае? Альбо, як у дзяцінстве “піпл хавае” толькі тое, што хоча, і што лёгка разумее, не патрабуючы хоць малога напружання. Ну, тады кожная крыху больш інтэлектуальна або эмацыйна ўскладненая праграма будзе здавацца яму не магчымасцю асабістага росту, а проста напышлівым умяшацельствам нуднага і замкнёнага свету «элітаў», даўно адарваных ад патрэбаў простага рабацягі, які чакае перад экранам свайго рэаліці-шоу.